«ВОСТРАЎ» ПЛЯБАНЬ

Чым можа здзівіць непрыкметная вёска?

Калі выйдзеш з электрычкі на прыпынку Ласі, то ў тыя самыя Ласі і трапіш. А можна збочыць управа і па асфальтаванай дарожцы нетаропка пабрысці да Плябані. Неаднойчы праязджаў праз гэтыя мясціны і нязвыклая назва заўжды выклікала цікавасць. Якая такая Плябань і хто там цяпер жыве, чым людзі займаюцца? — проста безліч пытанняў узнікала. Аднойчы не вытрымаў і сышоў на невялікім паўстанку...

Аляксей ЛЕМАНТОВІЧ прапануе пакаштаваць смачнай вады са старой студні.

КНЯЗЬ ЯГАЙЛА І ВАЎКІ

Папярэдне прагледзеў звесткі пра Плябань і зусім нямшат чаго адшукаў. Таму вельмі спадзяваўся даведацца пра вёску ад саміх месцічаў. Такая «тактыка» неаднойчы спрацоўвала (забягаючы наперад скажу: не падвяла яна і на гэты раз). Ад чыгуначнага насыпу спускаешся ў нізіну і так крочыш прама да моста, дзе нават пешаходны тратуар ёсць. Дарэчы, такія меры перасцярогі зусім нялішнія — па шашы раз-пораз сноўдаюць самазвалы (відаць, кар'ер непадалёк). У касіркі на чыгуначным прыпынку дакладна даведаўся пра дарогу да вёскі, таму ўпэўнена шпацыруя прама да храма, які велічна ўзвышаецца праз які дзясятак метраў ад рэчкі.

А насупраць — мастацкая галерэя! Гэта першае ў шэрагу здзіўленняў, якія выклікала Плябань (мяркуйце самі: невялічкая вёсачка, а мае цэлую мастацкую галерэю). Брамка адчыненая, шыльды пра злоснага сабаку на ўваходзе няма, таму смела накіроўваюся да ўвахода. Вось дзе можна даведацца пра вёску. У галерэі, як і належыць, ціха і цікава.

— Вось і наведвальнік нарэшце завітаў, — сустракае мяне загадчык галерэі Ала Ліхтаровіч. — То праходзьце, разам агледзім нашу экспазіцыю. Пакуль штат у нас зусім невялікі, бо галерэя толькі сёлета ў маі адчынілася. Вось і даводзіцца не толькі адміністрацыйныя пытанні вырашаць, але і творчымі ўшчыльную займацца. Добра, што мясцовыя жыхары шмат у чым дапамагаюць. У тым ліку і пра гісторыю паселішча цікава распавядаюць. Напрыклад, ад іх даведалася, што раней вёска называлася па-іншаму — Юрздына. А цяперашняя назва ўзнікла зусім нечакана.

Калісьці праязджаў у гэтых мясцінах Вялікі князь Ягайла. Нечакана на дарогу выскачылі ваўкі і коні, вядома, панеслі карэту. Беглі ажно да Юрздыны і спыніліся па-над самым абрывам над ракой. Ягайла горача маліўся аб выратаванні і даў зарок: калі ўсё добра абыдзецца, то тут абавязкова ўзвядуць храм. Так усё яно, дарэчы, і выйшла, аднак будоўля, самі ведаеце, як і ўсход, справа тонкая. Таму драўляны касцёл з'явіўся толькі ў 1500 годзе. Побач, праз дарогу, пабудавалі жыллё для ксяндза (плябанію) — адсюль і назва вёскі. У XVII стагоддзі падчас вайны святыня была знішчана, але ўжо праз непрацяглы час на ранейшым месцы быў узведзены новы храм. Пры ім дзейнічаў шпіталь, была сабраная вялікая бібліятэка. Замест драўлянага за сродкі вернікаў пачалося будаўніцтва каменнага касцёла, які ў 1850-х быў асвечаны біскупам Віленскім Вацлавам Жылінскім. Гэты велічны храм (той, што можна пабачыць і цяпер) за свае больш чым паўтара стагоддзя перажыў многае. З ім напрамую звязана адна з гераічных старонак нашай гісторыі — паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

ЗБРОЯ Ў КАСЦЁЛЕ

Пасля пабудовы храм дзейнічаў нядоўга. Дакладна вызначана, што ў сутарэннях касцёла паўстанцы Каліноўскага назапасілі тайны арсенал і пасля каля яго сцен узбройваліся атрады. Кіраўніком паўстання ў тутэйшых мясцінах быў Юльян Бакшанскі — чалавек вельмі адметны, жыццё якога вартае вялікага рамана. Ён нарадзіўся ў маёнтку Тупальшчына пад Смаргонню ў сям'і шляхціца. Вучыўся ў Віленскай гімназіі. За сувязь з тайнымі студэнцкімі гурткамі і захоўванне забароненай літаратуры 18-гадовы Юльян быў сасланы ў Разанскую губерню.

— У 1846-м Бакшанскі вярнуўся з выгнання і ўжо праз непрацяглы час напісаў вядомую «Адозву да смаргонскіх сялян», дзе заклікаў да народнага паўстання, — кажа Ала Ліхтаровіч. — Тут ужо ссылкай не абышлося — арышт і асуджэнне на 12 гадоў катаргі, якую адбываў у Нерчынску. Але ўсе гэтыя жорсткія выпрабаванні толькі загартоўвалі Бакшанскага. У 1863-м, калі вярнуўся на радзіму, ён арганізаваў і ўзначаліў атрад, які дзейнічаў у Ашмянскім і Віленскім паветах. Спачатку паўстанцаў было толькі крыху больш, чым два дзясяткі. А пасля атрад павялічыўся за кошт тутэйшых сялян.

Не дзіўна, што ў Плябані паўстанцы знайшлі надзейнае сховішча. Месцічы дасюль узгадваюць: старыя казалі, што касцёл, дом ксяндза і могілкі звязвалі надзейныя падземныя хады. Пра сутарэнні пад храмам не ведаю, а вось пад колішняй плябанню пабываць давялося. Пад падлогай — самы сапраўдны падземны паверх са сваімі функцыямі. Гэта вельмі дыхтоўныя памяшканні, скажу я вам, хадзіць там можна з маім немалым ростам не згінаючыся. Таўшчыня сценаў каля некалькіх метраў і відавочна, што збудаванне здольнае вытрымаць даволі магутныя ўдары. Магчыма, падчас рознага кшталту рэканструкцый тыя самыя хады проста засыпалі.

На той бок чыгункі ў засені векавых таполяў — старыя шляхецкія могілкі. Тут ужо даўно не праводзіцца пахаванняў. Пра ўзрост магіл сведчаць парослыя аксамітным мохам пліты з літарамі, якія цяпер не заўсёды і прачытаеш. Непадалёк — вялікі камень з крыжам уверсе.

— 21 мая 1863 года каля вёскі Свечкі (якая сімвалічная назва. — **М.Л.**) атрад Бакшанскага прыняў бой з царскімі войскамі, — заўважае Ала Ліхтаровіч. — Мяркуецца, што на гэтых могілках пахаваны Рафаіл Малішэўскі, Людвіг Ямант, Леапольд Банькоўскі, пятнаццацігадовы гімназіст Сулістроўскі і кіраўнік паўстання Юльян Бакшанскі, якія загінулі ў тым баі. Гэты пастамент быў усталяваны ў 1923 годзе, а ў 1970-х рэстаўраваны.

Праўда, на шыльдзе, якая чамусьці прыхіленая да каменя, пазначана наступнае: «Тут перапахавана зямля з брацкай магілы Кастуся Каліноўскага і Зыгмунта Серакоўскага — кіраўнікоў паўстання 1863 года, а разам з імі яшчэ 13 паўстанцаў. Перапахаваныя тут прынялі пакутніцкую смерць на шыбеніцы на Лукінскім пляцы места Вільні ўвесну 1864 года. Супакой ім і вечная памяць!» Гэта ўжо крыху іншая версія пахавання на старых шляхецкіх могілках каля Плябані. Таму сапраўдная версія пакуль што чакае свайго пацвярджэння. Напэўна, ужо ў найбліжэйшы час гэтая загадкавая гісторыя, звязаная з нашым слынным мінулым, будзе разблытана.

ЯК АДШУКАЦЬ ВЫЯВУ УЛАДЗІМІРА МУЛЯВІНА?

Пасля паўстання касцёл у Плябані быў зачынены, а ксяндза саслалі ў Сібір. У 1872-м храм перарабілі пад праваслаўную царкву. У мінулым стагоддзі тут зноў быў касцёл, а пасля Вялікай Айчыннай велічны будынак «традыцыйна» аддалі пад сховішча збожжа, а праз колькі гадоў — плодаагароднінных кансерваў (розных баршчоў, салянак, квашанай капусты і г.д.). Яшчэ праз нейкі час будынак увогуле застаўся безгаспадарным і паступова прыходзіў у заняпад. Ад яго засталіся толькі сцены, на якіх... трэніраваліся альпіністы. Напрыканцы 1990-х храм перадалі праваслаўным вернікам. З таго часу пакрысе тут праводзяцца работы па рэканструкцыі. Ужо адрамантаваны асобны пакой, дзе ідуць службы. Мне якраз удалося пабываць на адной з іх і ўвайсці ў храм. Унутры паўсюль стаяць рыштаванні і відавочна, што без дапамогі фундатараў аднаўленне зацягнецца надоўга.

— У былыя часы ў доме святара было шэсць пакояў, кухня, камора для прыпасаў, пярэдні пакой і веранда, — пералічвае Ала Ліхтаровіч. — Вялікі будынак абаграваліся вялікая печ і пяць кафляных грубак. На падворку былі гаспадарчыя пабудовы — тры хлявы, адрына, птушнік са склепам пад ім, парнік і свіран. Паводле плана Віленскай зямельна-кадастравай службы, які быў зроблены ў 1928 годзе, касцельнаму фальварку належала 35 гектараў зямлі ў ваколіцах Плябані і Краснага.

Падчас Вялікай Айчыннай у доме ксяндза знаходзіўся нямецкі шпіталь. Пасля вайны тут адчынілі вясковую пачатковую школу, якая працавала да сярэдзіны 1990-х. Менавіта ў гэты час у будынку правялі рэканструкцыю — перарабілі драўляную частку, але добра, што не кранулі падземны паверх.

— Тыя муры яшчэ паспрабуй разбурыць, — усміхаецца мясцовы жыхар Аляксей Лемантовіч. — Тут жа цагліны па ўсіх старадаўніх правілах зробленыя, не горш, чым цяпер. Знешні выгляд захавалі і тое добра. І сядзібу пакрысе аднаўляюць — вось побач і гаспадарчая пабудова, якая калісьці на фальварку была. Дах з гонту зрабілі — таксама нядрэнна выглядае, галоўнае, каб трывала было.

Пахаванне паўстанцаў на шляхецкіх могілках каля вёскі.

Аляксей Сяргеевіч нарадзіўся ў суседніх Малых Кашэўніках і з маленства прыязджаў да родных у Плябань. А пасяліўся тут з 1974-га, калі ажаніўся з мясцовай дзяўчынай. Лемантовіч узгадвае, што раней усё ў гэтай вёсцы было па-іншаму. Людзей жыло значна больш: сама меней па 5-6 чалавек у хаце, а цяпер — па адным праз дом. Зараз адна карова на вёску, а калісьці было больш чым паўсотні. Месцічы збіраліся ўсёй талакой на музычныя вечарыны — гралі на гармоніку, барабанах, цымбалах. Дарэчы, родны дзядзька Аляксея Сяргеевіча граў на цымбалах вельмі добра. І пляменніка вучыў.

Колькі гадоў таму і тутэйшая рэчка Уша разлівалася вельмі шырока.

— Вось пабачце (мы з Сяргеевічам падыходзім да ўскрайку даволі высокага пагорка, на якім стаяць сядзіба і касцёл) якая вышыня, — паказвае Лемантовіч. — А між тым падчас паводкі дасюль вада даходзіла. Мост быў драўляны і яго залівала. Так што даводзілася з берага на бераг на конях пераплываць ці на лодцы, альбо ісці па кладцы і трымацца за вяроўку, што табе перакідвалі. Так што Плябань тады была як сапраўдны востраў. Затое ракаў колькі лавілі і стронгі, шчупакоў, а цяперака адна калючка бярэцца.

Пакрысе турысты пачынаюць адкрываць для сябе Плябань. Сюды даволі часта прыязджаюць госці не толькі з райцэнтра, але і са сталіцы. На колішнім касцельным фальварку адна з турфірмаў ладзіць нават тэатралізаваны паказ. Сярод карцін, якія выстаўлены цяпер у галерэі, ёсць на што паглядзець. Напрыклад, адно з палотнаў мастака Яўгена Рагуновіча мае назву «Памяці песняра Мулявіна». На ім дзве птушкі ў нябёсах. Аднак ёсць тут свая загадка: калі ўгледзецца, то ў аблоках заўважыш выяву Уладзіміра Мулявіна...

Мікалай ЛІТВІНАЎ. Фота аўтара.

Маладзечанскі раён.

9 мільярдаў долараў — на беларускую АЭС

2113 старонак, 25 кніг, зведзеных у 9 тамоў — такой атрымалася папярэдняя справаздача аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе будучай беларускай АЭС, прапанаваная на разгляд грамадскасці.

На мінулым тыдні грамадскія слуханні папярэдняй справаздачы прайшлі па ўсёй краіне. На рэспубліканскім узроўні яны былі арганізаваны ў Астравецкім раёне (нагадаем, менавіта Астравецкая пляцоўка была абрана прыярытэтнай для будаўніцтва айчыннай атамнай станцыі). Удзел у абмеркаванні ўзялі прадстаўнікі шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, вучоныя з Акадэміі навук Беларусі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, прадстаўнікі розных палітычных партый і аб'яднанняў, расійскія і ўкраінскія спецыялісты.

Беларусь аказалася адной з нешматлікіх краін свету, якая, не валодаючы ўласнымі радовішчамі прыроднага газу, значна нарасціла яго долю ў першасным энергаспажыванні. З гэтага пачаў сваё выступленне на адкрыцці слуханняў **намеснік міністра энергетыкі Міхаіл МІХАДЗЮК.** Паводле яго слоў, доля прыроднага газу летась склала ў валавым спажыванні паліўна-энергетычных рэсурсаў 62 працэнты, а ў аб'ёме кацельна-пячнога паліва — 79 працэнтаў. Удзельная вага прыроднага газу ў айчыннай электраэнергетычнай галіне дасягнула 95—96 працэнтаў. Усё гэта робіць істотны ўплыў на ўзровень энергетычнай бяспекі Беларусі. Для выпраўлення сітуацыі Урадам і кіраўніком дзяржавы быў прыняты шэраг дакументаў, дзе былі вызначаны прыярытэтныя кірункі развіцця паліўна-энергетычнага комплексу. Сярод іх — дыверсіфікацыя (у тым ліку і за кошт прыцягнення ў агульнарэспубліканскі энергетычны баланс ядзернага паліва), максімальнае выкарыстанне мясцовых і аднаўляльных відаў паліва, укараненне сучасных энергазберагальных тэхналогій і г.д.

Міхаіл Міхадзюк паведаміў, што наяўных рэсурсаў недастаткова, каб закрыць патрэбы нашай краіны, а частку наяўных рэсурсаў ўвогуле эканамічна немэтазгодна выкарыстоўваць у якасці паліва. Ён нагадаў выказванне кіраўніка дзяржавы на пасяджэнні Савета Бяспекі, які падкрэсліў, што развіццё атамнай энергетыкі, разам з мадэрнізацыяй дзейнай энергасістэмы, выкарыстаннем аднаўляльных крыніц энергіі, скарачэннем энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту і дыверсіфікацыяй крыніц паступлення вуглевадародных сыравіны — самы важны фактар забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны, рэальная магчымасць супрацьстаяць дыктату манапалістаў і мінімізаваць урон пры ўзнікненні крытычных сітуацый.

Паводле слоў намесніка міністра энергетыкі, разлікі, выкананыя вучонымі беларускай Акадэміі навук, паказалі, што з пускам АЭС сабекошт электраэнергіі ў цэлым па энергасістэме знізіцца прыкладна на 20 працэнтаў, пры гэтым у разлік не прымаецца павышэнне цэнаў на газ. Гадавы аб'ём закупак прыроднага газу скароціцца на 4-5 млрд кубаметраў. З'явіцца магчымасць закупкі ядзернага паліва на шмат гадоў наперад.

Праектам расійскага бюджэту на найбліжэйшыя тры гады прадугледжаны сродкі на фінансаванне будаўніцтва АЭС у Беларусі. Пра гэта паведаміў **першы віцэ-прэзідэнт расійскага ЗАТ «Атамбудэкспарт» Аляксандр ГЛУХАЎ.** Ён адзначыў, што на гэтыя мэты плануецца выдаткаваць 9 млрд долараў. Праўда, праект бюджэту пакуль не зацверджаны, хоць, на яго думку, сума наўрад ці перавысіць зацверджаную ў кантракце.

— Дамоўленасць аб выдаткаванні расійскага крэдыту на будаўніцтва АЭС у Беларусі дасягнута на ўзроўні прэзідэнтаў дзвюх краін, таму цяпер відуцца работы ў гэтым кірунку, — адзначыў Міхаіл Міхадзюк. Ён жа паведаміў, што рыхтуецца пагадненне з Расіяй па будаўніцтве АЭС, у якім прадугледжваецца магчымасць закупкі паліва і ў РФ. Мяркуецца, што пагадненне будзе падпісана ў канцы кастрычніка.

Аляксандр Глухаў расказаў, што ў праект будаўніцтва АЭС ўключаны збудаванні па перапрацоўцы вадкіх адходаў і рэзервуары для іх захоўвання. Яны будуць знаходзіцца на тэрыторыі атамнай станцыі і разлічаны на першыя 20 гадоў функцыянавання АЭС.

Нагадаем, праект будаўніцтва АЭС на Беларусі прадугледжвае будаўніцтва двух энергаблокаў магутнасцю да 1,2 тыс. МВт кожны. Першы блок плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2016 годзе, другі — у 2018-м. Міхаіл Міхадзюк адзначыў, што ў перспектыве магчыма будаўніцтва трэцяга блока на камерцыйнай аснове.

Усяго для ўдзелу ў абмеркаванні папярэдняй справаздачы аб ацэнцы ўздзеяння беларускай АЭС на навакольнае асяроддзе зарэгістравалася 813 чалавек. Падчас выступленняў агучваліся самыя розныя погляды — былі і апантаныя прыхільнікі будаўніцтва беларускай АЭС і скептыкі. Пасля выступленняў, якія доўжыліся некалькі гадзін, члены прэзідыума далі адказы на пытанні, якія паступілі падчас слуханняў. Людзей цікавілі прадугледжаныя меры бяспекі будучай АЭС, яе магчымы ўплыў на экасістэмы і на здароўе мясцовых жыхароў, а таксама працаўладкаванне і адукацыя (дзе яе можна атрымаць?) работнікаў беларускай АЭС. Грамадскія слуханні ў Астраўцы праводзіліся ў адпаведнасці з сусветнай практыкай. Усе заўвагі і прапановы будуць улічаны пры складанні канчатковай рэдакцыі справаздачы аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе беларускай АЭС.

Інга МІНДАЛЁВА.

Астравецкі раён.

Храм не скараецца перад часам.

У жыллі ксяндза і цяпер ёсць на што паглядзець.

Колішняя плябанія і цяпер прымае шмат гасцей.

ВОСЕНЬСКІЯ ТУРБОТЫ

Восенню кірмашамі нікога не здзівіш. Ужо не першы год у Баранавічах гараджане ў кастрычніку закупляюць на зіму гародніну, але такога ажыятажу, які адбываецца па выхадных сёлета, ніколі не было. Насельніцтва кінулася нарыхтоўваць бульбу.

Неўраджай устрывожыў людзей і многія ўсхвалявaліся, каб бульба не паднялася ў цане. Нехта прадае яе па 750 ці па 850 руб./кг, але самая папулярная цана 800 рублёў. Убачыўшы, як бульбу загружаюць у багажнікі аўтамашын, вязуць па чатыры мяхі на веласіпедах ды нясуць праз вуліцу, мяне ахапіў неспакой. Трэба было б набыць 3 мяхі, але ж у нядзелю не знайшоў месца, дзе прыпаркавацца, а цягнуць тую бульбу за 200—300 метраў — далекавата.

Думаю, што бульбяны бум неўзабаве пойдзе на спад, ды і ў будныя дні прыватнікі бульбу прадаюць свабодна на «пятачках» — каля крамаў.

Гаспадаркі, у якіх сабралі неблагі ўраджай бульбы (а такія ёсць), сёлета будуць мець на гэтай культуры добры прыбытак і кошт яе мог бы быць і вышэйшым, але разам з павышаным попытам існуе і канкурэнцыя. У Баранавічы (а гэта паміж Брэстам і Мінскам самы буйны горад) бульбу вязуць не толькі з суседніх раёнаў, але і абласцей.

Што датычыцца іншай агародніны, то каля прадаўцоў з цыбуляй (1000 руб./кг), морквай (700 руб.) ды капустай (700 руб.) людзі асабліва і не тоўпяцца. Надзіва шмат памідораў. Здавалася б, іх сезон ужо мінуў, а цана невысокая — 2000—2500 руб./кг, як і месяц таму.

Усе размовы на тутэйшым узроўні, што з неўраджаем бульбы «нагаладаемся», аказаліся пустымі. Бульба ёсць, і кошт яе прымальны для пакупніка.

* * *

Два месяцы не быў на цэнтральным рынку (кааператыўным), і калі зазірнуў туды ў мінулую суботу, то прыкметных зрухаў у цане не прыкмеціў.

У мясным павільёне прадаўцоў многа, а пакупнікоў — не вельмі. Людзі ёсць, але не ціснуцца каля прылаўкаў, як бывала. Дзіўна, але цана на мясныя прадукты за гэты перыяд асабліва не варухнулася, хіба што на цяляціну крыху падрасла — на нейкую тысячу. Цяпер яе кошт ад 14,5 да 18 тысяч. А за 1 кг кумпяка просяць 14—16 тысяч, паляндвіца — 18 тысяч.

Свежая каўбаса, у сэнсе «пальцам пханая» — 11—14 тысяч, на сала таксама разбежка — 12—16 тысяч. Многае залежыць ад яго таўшчыні, мяснога слою і прыгатавання, калі салёнае.

Можна зрабіць выснову, што цана прывязана да зарплаты. Калі б яе рост у насельніцтва назіраўся, то і цана на рынку папаўзла б угару, хоць у крамах кошт прадуктаў усё ж падымаецца — непрыкметна, пакрысе, але ёсць...

* * *

Апошнія два тыдні стаяла грыбное надвор'е. Здавалася б, што яшчэ трэба, каб зялёнкі, апенькі ды грузды палезлі на «свет божы»? Вось і падаўся з сям'ёю ў лес — за 35 км ад горада.

Прыехалі, а ў лесе цемнавата, і давялося паўгадзіны пачакаць, каб вока магло лісце ад грыбоў адрозніць.

Зайшлі ў лес і закралася трывога, што грыбоў не будзе. І гэтае пачуццё мала калі падводзіла. Калі грыбы ёсць, то яны на кожным тваім кроку нагадваюць пра сябе. Гэта могуць быць сыраежкі, скрыпіцы ці «воўчыя» грыбы, але калі ты іх бачыш, то ведаеш, што дзесьці побач схаваўся і больш важкі грыб. А тут ціха, сумна і толькі зрэдку ржавыя кабылкі трапляюцца — позні восеньскі матыў. Але бывалі часіны, калі і 5 кастрычніка баравікоў можна было набраць. За тры гадзіны паднялі з дзясятак зялёнак, кабылак ды баравік — адзіны і чарвівы.

Дарэчы, кажуць, што кабылкі шкодныя для здароў'я — псуюць кроў, ці што. Я ў гэта не веру — бо ведаў старых людзей, якія пражылі вельмі доўгае жыццё і тыя кабылкі для іх былі звычайнымі грыбамі — ніхто іх не адкідваў. Гэта як з салам. Хто толькі ні пісаў, што сала — спрэс халестэрын, а сёння чытаеш, што сала — самы чысты ў экалагічным плане прадукт і халестэрыну ў ім нуль.

Магчыма, дзесьці грыбы, як і тая бульба, урадзілі, але ў нашай мясцовасці сёлета ўдалося ўхапіць хіба што лісічак.

Бывайце, грыбы, да вас больш я ні нагой... можа ў наступным годзе. Але калі ўбачу некага з кашом зялёнак, то хто ведае...

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

Праехаліся

Ноччу з тэрыторыі майстэрняў ААТ у в. Хорава Пружанскага раёна нехта ўкраў два трактары МТЗ. Аператыўная група тэхніку знайшла: адзін трактар стаяў пашкоджаным на аўтадарозе каля в. Борнавічы, а другі — каля в. Піняны. Трактары выкралі маладыя людзі, якія ўжо пабывалі ў калоніі, — жыхар в. Скорцы і зваршчык ПМК з в. Наскі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БЕЛАРУСКАЯ ІРЛАНДЫЯ

ДАРОГА НА ДУБЛІН пралягае праз бяскрайнія зялёныя палі. Машына то падымаецца на ўзгорак, то зноў спускаецца ў нізіну. На забалочаных лугах яшчэ пасвіцца жывёла. Надвор'е непастаяннае: за апошнія дзве гадзіны тры разы імжэў дождж, пяць разоў выглядвала з-за хмараў сонца. Вецер не супакойваецца ні на хвіліну. І ўсё ж такі для большай перакананасці, што я знаходжуся ў Ірландыі, устаўляю навушнікі з кельцкімі мелодыямі...

Вёска з ірландскай назвай Дублін размясцілася сярод балот Брагінскага раёна. Гэта цяпер дабрацца сюды па асфальтавай дарозе не выклікае цяжкасцяў, а да пачатку меліярацыі адзіным сродкам перамяшчэння тут былі лодкі. Нават працавалі «маршрутчыкі», якія за 20 капеек перавозілі тутэйшае насельніцтва на лодцы праз балота ў Брагін, а гэта ні многа ні мала — 6 кіламетраў! Дарэчы, сталіца Ірландыі ў свой час таксама была заснавана на дрыгве.

Насамрэч, з зялёным востравам беларускі Дублін аб'ядноўвае значна больш, чым, напрыклад, Лагойск са Швейцарыяй. Гадоў сем таму сюды прыязджалі ірландскія карэспандэнты, здымалі фільм пра вёску і яго жыхароў. Такая цікавасць з іх боку невыпадковая. Па адной з версій аб паходжанні вёскі, калісьці тут размяшчалася рота ірландскіх наёмнікаў, якія вырашылі стварыць на чужыне кавалачак далёкай радзімы. На жаль, калі гэта было — ужо ніхто не памятае. Летапіс у вёсцы ніхто ніколі не вёў, а з архіўных дакументаў шмат інфармацыі пра Дублін не пачэрпаеш.

Ірландцы на Брагіншчыне маглі з'явіцца значна раней, чым можна сабе ўявіць. Ёсць звесткі, што да пачатку татарскага нашэсця ў Кіеве дзейнічаў кляштар Дзевы Марыі, які быў на ўтрыманні ірландскіх манахаў. Брагінская зямля належала ў той час Кіеўскаму княству. Магчыма, што ўжо ў XII стагоддзі місіянеры хадзілі з паданнямі і па навакольных вёсках. Да таго ж самай блізкай дарогай з Ірландыі да Кіева быў «шлях з варагаў у грэкі», які пралягаў праз Брагіншчыну. У XIII стагоддзі, дзякуючы аднаму з ірландскіх місіянераў, з'явілася першая згадка пра Белую Русь, і што асабліва прыкметна, у Дублінскім рукапісе.

На мяжы XVI—XVII стагоддзяў значна аслабела Маскоўская дзяржава, чым паспешліва вырашылі скарыстацца беларускія магнаты. Магчыма, у гэты час ў наваколлі сучаснага Дубліна з'явіліся першыя наёмнікі з зялёнага вострава. Брагіншчына на той час была памежнай тэрыторыяй, таму сюды маглі быць перакінуты атрады замежнікаў. Да таго ж, менавіта тут упершыню заявіў пра сябе князю Адаму Вішнявецкаму і заручыўся яго падтрымкай Ілжэдзмітрый I. Ірландскія ваяры ўдзельнічалі ў паходах на Маскву, а калі падзеі разгортваліся не па сцэнарыі, пераходзілі на бок рускіх.

Магчыма, у пачатку XVII стагоддзя вёска і атрымала сваю назву. У гэты ж час яна трапляе ў пісьмовыя крыніцы. Але ірландская версія паходжання Дубліна з'явілася адносна нядаўна. Дагэтуль хадзіла легенда, што нібыта ў вёсцы стаяў на ўзгорку вялікі дуб, таму і назвалі паселішча Дублін.

Сёння — гэта невялікая вёсачка, якая ўтвараецца перасячэннямі некалькіх вуліц. Жыве тут менш за 300 чалавек. Менавіта з-за гэтай прычыны пару гадоў таму мястэчка пазбавілі статусу цэнтра сельсавета. Уздоўж трасы размясціліся пафарбаваныя хаты, а на ўскраіне высяцца пакінутыя двухпавярховікі і забыты дзецьмі дзіцячы садок. Цяпер вырашаецца пытанне аб закрыцці школы: рабочага персаналу больш за навучэнцаў.

У Дубліне ёсць нават свае гістарычныя каштоўнасці. Гэта дзве драўляныя чатырохсхільныя хаты з чаротавым дахам — добры прыклад таго, як выглядалі хаты на Палессі да прыходу сюды сучаснай цывілізацыі. Але толькі вонкавы выгляд захаваў свае аўтэнтычныя рысы: унутранае ўбранне, відаць, было набліжана да сённяшняга. Цяпер гэтыя хаты размешчаны на самым уездзе ў вёску. Гаспадары іх памерлі некалькі гадоў таму, і «помнікі архітэктуры» засталіся нікому не патрэбныя. Прысядзібныя соткі параслі травой, а ўнікальныя хаты разваліваюцца на вачах. Блізкія памерлых, відаць, не збіраюцца вяртацца ў родныя мясціны, таму было б нядрэнным перадаць хаты ў добрыя рукі.

Не было мяжы радасці і здзіўлення ірландскіх карэспандэнтаў, якія хадзілі па вёсцы і фатаграфавалі саламяныя дахі. Яны адчувалі сябе першаадкрывальнікамі невядомага дагэтуль свету. Яны пабачылі Дублін такім, якой ніколі не была ірландская сталіца. Асаблівую цікавасць ў гасцей выклікалі шытыя мясцовымі майстрамі ручнікі. Дублін — вёска, якая з-за адной назвы павінна прыносіць неблагія грошы. Патэнцыяльныя кліенты — турысты з Ірландыі. Але пакуль фінансы Дублін абыходзяць бокам...

У адрозненне ад сапраўднай Ірландыі, ехаць працаваць у вёску Дублін ахвотнікаў мала. Жывуць тут пераважна старыя людзі: хто ад нараджэння, а хто і з сселеных хутароў. Уладзімір Кур'ян, ветэран Вялікай Айчыннай, адзін з нямногіх мясцовых жыхароў, хто можа сёння праводзіць экскурсіі для гасцей. Памятае ён тыя часы, калі Дублін быў яшчэ адарваны ад свету балотамі. Памятае, як сям'я жыла ледзь не ў зямлянцы. Калі савецкая ўлада пачала «зганяць» сялян у калгасы, яго бацька быў першым, хто ўступіў, ад чаго сям'ю не вельмі далюблівалі заможныя вяскоўцы. Былі падпалы, выразалі скаціну. Раённае партыйнае кіраўніцтва дапамагло знайсці грошы, каб адбудавацца.

Падчас вайны Уладзімір Савельевіч знаходзіўся на фронце, а пасля яе заканчэння лёс зноў прывёў яго на малую радзіму. Тут і застаўся да сённяшняга дня. Працаваў днём у калгасе, вечарамі чытаў для неадукаваных вяскоўцаў газеты ў мясцовым клубе. У Дубліне спадар Уладзімір вядомы сваімі навыкамі цырульніка. Нават захаваліся трафейныя нямецкія нажніцы і машынка, якія ён з гонарам паказвае гасцям.

На сваё жыццё ветэран скардзіцца не прывык. Яго і павіншуюць у патрэбны час, і на «Ваша лато» на розыгрыш у сталіцу звозяць. Затое праблемы з водазабеспячэннем узнікаюць. Праводзілі рамонтныя работы, сапсавалі калонку, пачала знікаць вада ў калодзежы.

Адзінае, што заўсёды ў парадку — дублінская медыцына. Фельдшар Марыя Герасімаўна самы паважаны спецыяліст у ірландскім краі. Будзь на дварэ ночь ці дзень, заўсёды можна разлічваць на хуткую дапамогу. У Дубліне дастаткова добра працуе мабільная сувязь, ёсць стацыянарная тэлефанія. Калісьці існавала капліца, але барацьба з «опіумам народа» зрабіла сваё.

Пасля таго, як у вёску завіталі ірландцы, жыхары пачалі лічыць сябе нашчадкамі кельтаў. Цяпер і самае папулярнае ў Дубліне прозвішча Кур'ян лічыцца замежным. Напрыклад, рускі паэт Лермантаў паходзіць ад ірландскага ваеннага Лерманта, які прыбыў наёмнікам у Рэч Паспалітую пад вайну з Масквой, а потым перайшоў на бок праціўніка.

Паміж Беларуссю і Ірландыяй можна нярэдка правесці значна больш паралеляў, чым з якой іншай еўрапейскай краінай. У нас подобная гісторыя. Доўгі час мы залежалі ад больш уплывовага суседа. Нават моўная сітуацыя ў краінах амаль што капіруе адна адну. Праўда, апошнім часам у Ірландыі схіліліся ў бок роднай мовы, чаго не назіраецца пакуль што ў нас. Разам з ірландцамі ў свой час беглі за акіян і беларусы. Наша краіна стала другой радзімай знакамітаму роду О'Руркаў. Ірландскія місіянеры прынеслі еўрапейскую культуру на нашы землі. Толькі гэтых фактаў дастаткова, каб у Беларусі з'явіўся маленькі кавалачак далёкага вострава ў вёсцы Дублін.

Уладзіслаў КУЗЬМІН.

Уладзімір КУР'ЯН быў першым цырульнікам на вёсцы.